# РАЗДЗЕЛ 2
# МАЙСТЭРСТВА ІВАНА ШАМЯКІНА-ПІСЬМЕННІКА

## РОЛЯ ДЗЁННІКАЎ І. ШАМЯКІНА Ў АСЭНСАВАННІ ЯГО АСОБЫ І ТВОРЧАСЦІ

**А. І. Бельскі**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. К. Маркса, 31, 220050, Мінск, Беларусь, a_belsky@tut.by*

У артыкуле разглядаюцца дзённікі класіка беларускай літаратуры Івана Шамякіна, якія ўтрымліваюць багатую факталогію для асэнсавання мастацка-творчага працэсу, ведання сакрэтаў пісьменніцкай лабараторыі. У выніку выяўляюцца такія рысы асобы пісьменніка, як адкрытасць людзям і свету ва ўсіх праявах і талстоўства, а таксама іпастасі філосафа-шукальніка праўды пра зменлівы і драматычны час і летапісца-хранікёра нялёгкага жыцця народа на мяжы стагоддзяў.

***Ключавыя словы***: Іван Шамякін; творчасць; біяграфія; дзённікі.

Іван Шамякін (1921–2004) – адзін з самых вядомых беларускіх пісьменнікаў XX ст., класік, шэраг твораў якога сталі хрэстаматыйнымі. Здавалася, яго біяграфія і творчасць добра вывучана і даследавана, прытым у розных дыскурсах і аспектах. Спашлёмся на кнігу В. А. Каваленкі «Іван Шамякін: нарыс жыцця і творчасці», якая выйшла ў серыі «Народныя пісьменнікі БССР» у 1980 г. [5]. Вялікі бібліяграфічны матэрыял пра жыццёвы і творчы шлях І. Шамякіна змяшчае шасцітомны слоўнік-даведнік «Беларускія пісьменнікі» (1995, т. 6) [гл.: 2, с. 315–332]. Звяртае ўвагу ўжо сваёй назвай кніга «Іван Шамякін:

вядомы і невядомы» (2011), дзе асабліва каштоўныя для асэнсавання асобы і творчасці народнага пісьменніка ўспаміны, а таксама артыкулы Т. І. Шамякінай, ягонай дачкі [4]. Калі мець на ўвазе асноўныя працы ў галіне шамякіназнаўства, то можна канстатаваць: літаратурны партрэт І. Шамякіна дастаткова дакладны ў сваіх рэальных абрысах і дэталях, раскрыты асаблівасці яго творчай індывідуальнасці, мастацкага свету. Больш за тое, М. І. Мушынскі стварыў грунтоўны, падрабязны летапіс жыцця і творчасці народнага пісьменніка [6].

Апрача афіцыйнага жыццяпісу, хрэстаматыйнага глянцу, у кожнага класіка і вядомага пісьменніка ёсць свая ўнутраная біяграфія – насычаная, часам досыць няпростая. Пра гэта добра сказаў П. Панчанка: «Усё ў маёй біяграфіі запісана? А бяссонныя ночы? А боль?» [7, с. 6]. На схіле зямнога веку былі бяссонныя ночы і ў Івана Пятровіча Шамякіна, ён апынуўся ў стане гнятлівай экзістэнцыі: «пастаянна скардзіўся на адзіноту, неразуменне, пустэчу ў жыцці. Не раз гаварыў і пра смерць» [4, с. 32]. Ён пісаў свае начныя ўспаміны, ратаваўся імі, творчасцю. У першую чаргу нас цікавіць унутраная біяграфія пісьменніка, «чалавечае вымярэнне» ягонай асобы, «уяўленне пра мастацкую творчасць як спосаб увасаблення “чалавечага, занадта чалавечага”», «тыя якасці чалавечай асобы, якія закладваюцца ў аснову аўтарскай задумы» [8, с. 16, 17]. У гэтай сувязі асаблівую значнасць і каштоўнасць набываюць дзённікі І. Шамякіна, якія ўтрымліваюць багатую факталогію, унутрана-змястоўны пласт інфармацыі, важныя, вельмі істотныя звесткі для асэнсавання мастацка-творчага працэсу, ведання сакрэтаў пісьменніцкай лабараторыі.

З дзённікавых запісаў пачатку 1980-х гг., аб’яднаных назвай «Карэнні і галіны», мы больш даведваемся пра радавод І. Шамякіна, сваяцка-роднасныя сувязі яго сям’і. Пісьменнік апавядае пра бацькоў і дзядоў, іх жыццё і чалавечыя якасці, узнаўляе шматлікія біяграфічныя факты, прычым гаворыць шчыра, праўдзіва, успамінае асобныя надзвычай цікавыя эпізоды з дзяцінства Апрача гэтага, у шамякінскіх дзённіках, набліжаных да мемуарыстыкі, знаходзім праявы ўнутранага свету асобы аўтара, які

знаходзіцца ў працэсе самааналізу, рэфлексій, асэнсавання таго, што з ім адбылося. Вось у якой жыццёвай сітуацыі апынуўся пісьменнік у маі 1982 г. праз мітрэнгі, звязаныя з раманам «Петраград – Брэст», яго выданнем: «Палохае нейкая паслядоўнасць udараў лёсу, іх спалучэнне: пералом рукі, смерць сястры Галі, цяпер – вока. Думаю, гісторыя з раманам, расчараванне ў людзях, якія абвяшчалі сябе… сябрамі, не апошнюю ролю адыгралі ў захворванні. Ахапіла нуда. І крыўда» [10, с. 271–272]. Знешне паспяховы, вядомы, статусны савецкі пісьменнік – і раптам трапляе ў цяжкі, псіхалагічна складаны стан унутранай экзістэнцыі, прызнаецца: «Пачынаеш жыць з аглядкай – не стукнула б яшчэ з якога боку! Можа, трэба і праз такое прайсці?.. Часам думаеш: выйду з бальніцы – і буду жыць зусім інакш. Як? Не буду! Будзе тое ж: гарэнне, хваляванне, выступленні, жаданне пісаць. Але будзе горш: жаданне ёсць, а сілы няма – найгоршая трагедыя. Хоць, між іншым, вось зараз і пісаць не хочацца» [10, с. 273]. І далей: «Нават да Андрэя (Андрэя Макаёнка, лепшага сябра Шамякіна. – А. Б.) не цягне так, як раней. Яшчэ нядаўна Маша (жонка пісьменніка. – А. Б.) раўнавала: “Ты не можаш пражыць без яго і аднаго дня”. Не мог. А цяпер магу жыць тыдзень, месяц. Што гэта: першая прыкмета старасці – жаданне адзіноты…» [10, с. 282]. Стан пісьменніка, як бачым, не лепшы, а дакладней, дэпрэсіўны. Што ж ратуе Шамякіна-літаратара і чалавека насуперак песімізму? Ён знаходзіць духоўнае і жыццёвае апірышча – гэта ў першую чаргу яго родава-сямейны грунт, вяртанне ў мінулае да сваіх вытокаў і каранёў, успаміны пра дзяцінства. Галоўнае, ён піша – піша аўтабіяграфічную прозу, апавядаючы пра блізкае, дарагое, перажытае. І. Шамякін, адкручваючы стужку мінулага, здзяйсняе падарожжа ўглыб сваёй памяці, часу праз яго чалавечае вымярэнне, падключае пры гэтым жыццёвы досвед.

На старонках дзённіка сустракаем меркаванне пісьменніка пра стэрэатыпны погляд на сваю асобу і творчасць. Ён не прымаў шырока распаўсюджанай думкі-ацэнкі: «Крытыка і чытачы лічылі мяне пісьменнікам сучаснай тэмы. Хоць, прызнаюся, сам я не думаў так катэгарычна, што я толькі распрацоўваю надзённыя тэмы»

[10, с. 273]. Пісьменнік на матэрыяле сучаснасці, апрача па-грамадску значных і надзённых актуалій, заўсёды асэнсоўваў важныя маральна-этычныя праблемы і філасофска-аксіялагічныя пытанні чалавечага жыцця і ўладкавання соцыуму. У пісьменніцкім дзённіку ёсць паасобныя каштоўныя сведчанні і прызнанні, важныя для разумення сутнасных чыннікаў і фактараў творчасці Шамякіна-празаіка, генерыравання і рэалізацыі ім мастацкіх задум, увасаблення сюжэтаў і вобразаў. Вось адно з такіх прызнанняў, якое дапамагае асэнсаванню суадносін біяграфічнага і аўтарскага вымыслу, дакументальнага і мастацкага: «Гэтае сваё першае свядомае рамантычнае спатканне я падрабязна напісаў у апавяданні “Непрыгожая”, хоць, безумоўна, з пэўнай доляй вымыслу… Так падрабязна напісаў я пра свой апошні школьны год таму, што, здаецца, менавіта там нараджалася, расла тая фантазія, якая пасля стала асновай творчасці, крыніцай яе. З таго года ў памяці засталося больш, чым з любога іншага. Хіба толькі вайна пакінула гэтак жа многа ўспамінаў. Між іншым, я менш, чым хто з маіх калег-франтавікоў, выкарыстоўваў у творчасці асабіста перажытае… Усё іншае – «Глыбокая плынь», «Сэрца на далоні», «Снежныя зімы», «Гандлярка і паэт», «Шлюбная ноч», «Вазьму твой боль» – падказана трагедыяй народа, гераізмам партызан і падпольшчыкаў» [10, с. 336, 337].

Дзённікі І. Шамякіна «Роздум на апошнім перагоне» (1995) – кніга аўтадакументальная, пісьменнік апавядае пра сябе і свой час, з яе вымалёўваецца яскравая постаць і партрэт творчай асобы ў кантэксце часу, грамадскіх і палітычных падзей. Івану Пятровічу выпала жыць у зломную эпоху, так званы пераходны перыяд, калі пасля распаду СССР адбывалася станаўленне новай суверэннай і незалежнай дзяржавы – Рэспубліцы Беларусь. Запісы 1990-х гг. палітызаваныя, тут знайшлі адбітак многія факты найноўшай гісторыі праз асабістае ўспрыманне вядомага пісьменніка, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча. Згадаем, што ў 1971–1985 гг. І. Шамякін быў старшынёй Вярхоўнага Савета БССР, у 1963–1985 гг. – дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, у 1980–1989 гг. – дэпутатам Вярхоўнага

Савета СССР, да таго ж уваходзіў у склад ЦК КПБ. Мы пакідаем па-за кантэкстам грамадска-палітычныя погляды пісьменніка, яго суб'ектыўна-ацэначныя меркаванні адносна шэрагу негатыўных з'яў і працэсаў, выкліканых развалам Савецкага Саюза. Нас цікавіць дзённікавы матэрыял першай паловы 1990-х гг. у плане спецыфікі і трансфармацыі аўтарскага наратыву, вывучэння працэсу нараджэння новых тэм, сюжэтаў і тыпаў вобразаў-персанажаў. Робячы запісы па гарачых слядах падзей, пісьменнік дзяліўся тым, што яго хвалюе, якую рэакцыю выклікаюць у яго змены ў грамадстве, памкненні і паводзіны людзей у постсавецкі час, калі пачаліся сур'ёзныя праблемы і выпрабаванні.

На тагачасныя надзённыя падзеі бягучага дня, сучаснасці І. Шамякін адгукнуўся творамі ў жанры аповесці «Paradies auf erden», «Вернісаж» (абедзве – 1992), «Сатанінскі тур», «Падзенне», «Адна на падмостках» (усе – 1993), «Без пакаяння» (1995), «Палеская мадонна» (1996), «Крывінка» (1995–1996) і інш. Пісьменнік, як бачым, працаваў шмат і надзвычай інтэнсіўна. У дзённіку ёсць цікавыя сведчанні менавіта пра той перыяд літаратурнай працы І. Шамякіна, мадэльнае канструяванне сюжэтаў і бачанне вобразаў, іх трактоўку, працэс творчых пошукаў і рэалізацыі задум: «Пісаў "Адну на падмостках". Апантана пісаў. Учора закончыў, роўна месяц працы, пачаў 1 жніўня, скончыў – 31-га. 80 старонак – тры аркушы. Сімбіёз прозы і драматургіі не спатрэбіўся, ды і наўрад ці можна было гэта ажыццявіць. У працэсе напісання, не, начамі, калі абдумваў хады, прыйшла нядрэнная кампазіцыя, эканомная: на трох аркушах – доўгае жыццё гераіні…» [13, с. 456]; «Невялікі зрэз сучаснага жыцця: падзенне новых гаспадароў і старых чыноўнікаў – тэма, якая праходзіць у "Падзенні". Утрымаўся ад спакусы пабудаваць дэтэктыўны сюжэт, першапачаткова ўзнікла такая канструкцыя. Сцэна аперацыі патрабуе кансультацыі з хірургамі» [13, с. 506]. Агульнавядома: Іван Шамякін – майстар сюжэта, які дасканала валодаў тэхналогіяй пабудовы фабулы. Ён зазначае: «Цікавы гэта працэс – канструяванне сюжэта. Мала хто з практыкаў раскрыў спружыны сюжэтаўтварэння. Тэарэтыкі напісалі нямала цікавага, але,

бадай, галоўнага не сказалі» [13, с. 506]. Безумоўна, у творцы былі свае сакрэты пісьменніцкага мастацтва і майстэрства. Зрэшты, даследчыкі і крытыкі дастаткова глыбока «пранiклі» ў творчую лабараторыю І. Шамякіна, вывучылі яго вопыт сюжэтабудавання і аўтарскі наратыў, у гэтай сувязі можна называць працы пачынаючы ад В. Каваленкі і да Т. Шамякінай. Тым не менш сведчанні і меркаванні самога пісьменніка важныя, патрэбныя, досыць каштоўныя пры характарыстыцы творчасці, іх неабходна ўлічваць, бо яны дадаюць пэўныя аргументы і доказы на карысць той ці іншай інтэрпрэтацыі, яе належным абгрунтаванні.

Возьмем, да прыкладу, зварот пісьменніка да жанру кароткай аповесці. Чым можна растлумачыць пераключэнне пісьменніка-раманіста (а менавіта такі імідж замацаваўся за Шамякіным-празаікам у савецкі час) на сярэднюю эпічную форму, на больш сціслую форму аповеду? Аповесць – меншая за раман тэкставая структура, у жанравых адносінах тут наратыў прадугледжвае фабульны дынамізм і кампактнасць выкладу зместу. У традыцыйным айчынным разуменні жанру аповесці гэта штосьці большае за апавяданне і яе значны аб’ём, персанажны склад набліжаны да рамана, уяўляе сабой фармат кшталту міні-рамана. Безумоўна, пры напісанні твораў пра сучаснасць адыграў узроставы фактар: «Садзіць сябе за раман баюся. Ды і харошы гэта жанр – кароткая аповесць. Дарэмна раней ігнараваў» [13, с. 441]. Дзённікавыя запісы 1990-х гг. яскрава засведчылі, што І. Шамякін не збаўляў актыўнасць, працягваў напружаную творчую працу, якая вымагала вялікіх фізічных і ўнутраных высілкаў: «За тры тыдні выдыхнуў “Без пакаяння” – сто старонак. Працаваў, як нячаста рабіў гэта нават у маладосці: па пяць старонак у дзень выдаваў, па чатыры гадзіны сядзеў за сталом. Але так нельга – наганяў галаўны боль. Нельга ў маім узросце перагружаць мозг… Па-мойму, атрымалася» [13, с. 506]. Іван Пятровіч прызнаваўся, што зведваў радасць, задавальненне ад таго, што той ці іншы твор атрымаўся, аднак у пэўныя моманты зноў і зноў выказваў скепсіс, сумненні наконт запатрабаванасці пісьменніцкага слова: «Заўтра здам кнігу

і сяду за новую аповесць. Трэба пісаць! Хоць нярэдка апякае думка: а навошта? Для каго?... І ўсё роўна – трэба пісаць!» [13, с. 486]. Напэўна, спадзяваўся: а вось прачытаюць, пачуюць, задумаюцца…

Народны пісьменнік, ён не мог не думаць пра народ, яго лёс і будучыню, адчуваў унутраную патрэбу пісаць, гаварыць людзям праўду. Быццё-існаванне ўскладняў Чарнобыль з яго наступствамі, што І. Шамякін засведчыў і паказаў у рамане «Злая зорка» (1991), аповесці «Зона павышанай радыяцыі» (1997). Пачатак 90-х гг. ХХ ст. – час дэфіцыту, нястачы, выжывання ў неспрыяльных сацыяльных абставінах. Іван Пятровіч у сваіх творах адрэагаваў на эканамічныя цяжкасці, бядотнае існаванне людзей, і ў першую чаргу творчай інтэлігенцыі. Але не толькі гэта турбавала і непакоіла пісьменніка, найперш насцярожвала і трывожыла маральная дэградацыя грамадства, самаразбурэнне асобы, расчалавечванне свету. Для яго пачаўся этап экзістэнцыйна напружанага жыцця ва ўмовах кардынальных перамен і ўскладнення сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў краіне. 15 лютага 1992 г. Іван Пятровіч робіць запіс: «Бывае роспач страшэнная. Але жыць усё роўна хочацца. Што там – наперадзе?» [13, с. 373]. Рэакцыя яго на змрочныя фарбы і негатыў у СМІ была напачатку адмоўнай: «Дайце людзям надзею! Не пра распад і роспач трэба пісаць – трэба і мне пісаць! – пра Надзею, Веру, Любоў» [13, с. 375] (запіс ад 21 лютага 1992 г.). Аднак жыццё і навакольная рэчаіснасць не прыносілі радасці і захаплення, не дадавалі веры і аптымізму, праявы негатыву і рэальнасць абсурду выклікалі ў пісьменніка ўнутраную нязгоду, непрыманне, нават пратэст, таму ён гранічна ясна ўсвядоміў сваю мастакоўскую задачу: неабходна паказаць жыццё і чалавека такімі, як ёсць, з пазіцый вострай сацыяльнай крытыкі, без усялякай ідэалізацыі, з жорсткім, выкрывальным рэалізмам. І. Шамякін добра разумеў і прызнаваў, што ў савецкі час сам аддаў даніну мастацкай ідэалізацыі і пэўным стэрэатыпам: «Нас адвучылі пісаць людзей такімі, якімі яны ёсць, нас вучылі іх ідэалізаваць» [13, с. 499]. У дзённіку выяўляецца пазіцыянаванне ідэйных поглядаў аўтара, які выразна ўсведамляе сваю задачу як пісьменніка,

акрэслівае прынцыповую пазіцыю ў дачыненні да антаганістаў, антыгерояў: «Да буржуазіі… адносіны ў мяне да заблытанасці складаныя. Сацыяліст і гуманіст, я буду іх выкрываць» [13, с. 485]. Пра абраны творчы метад паказу рэчаіснасці яскрава сведчаць наступныя дзённікавыя фрагменты: «Нечакана ў адну ноч сканструяваў апавяданне. Пачаў пісаць. Апавяданне – прагноз. Сумнае і злое» [13, с. 388]; «Скончыў "Вернісаж". Страшная аповесць. У фінале. Але ж праўда – такі лёс мастака!» [13, с. 411]; «Улез у аповесць. У страшную аповесць: да якога падзення даходзяць людзі ў выніку рынку (базар, а не рынак), пагоня за грашамі, за доларамі асабліва, робіць людзей нелюдзямі, у думках іх не застаецца нічога святога. Пішу з хваляваннем. Вельмі шкада героя, шчырага чалавека, вучонага, які памірае ў дарозе. Пішу і плачу» [13, с. 434].

Матэрыяльнае становішча людзей у першай палове 1990-х гг. няўхільна пагаршалася, некаторыя вымушаны былі выжываць, па сутнасці шукаць магчымасці існаваць у неспрыяльных абставінах, а хтосьці бессаромна ўзбагачаўся, назапашваў капітал, каб быць у шэрагу новых «гаспадароў» жыцця. Постсавецкі час спарадзіў свядомасна-псіхалагічныя змены, экзістэнцыйны драматызм і праблему чалавека, дакладней, чалавечага ў чалавеку. Іван Пятровіч заставаўся маральным максімалістам, для яго быў непрымальны прынцып «выжыць любой цаной», яго палохала перспектыва з'яўлення дэгуманізаванага грамадства. Ён дакладна пазначаў негатыўныя тэндэнцыі, канстатаваў, што з чалавекам і ў цэлым з грамадствам адбываецца бяда. У аповесці «Падзенне» аўтар піша: «…у наш час усё прадаецца і купляецца, і ў першую чаргу сумленне», а потым пераходзіць да паказу маральна-ментальных змен героя, які робіцца хабарнікам: «Два дні баяўся, каб сумленне не штурхнула яго на неабачлівы крок. Не, трохі пасмактала душу, як душа пустышку, і… заснула – сумленне заснула» [12, с. 203, 206]. А вось што мы даведваемся з дзённіка пра аўтарскую канцэпцыю так званага героя, амаральнага чалавека ў аповесці «Падзенне»: «"Накручваю" сюжэт новай аповесці. Аб

чалавеку, кіраўніку, які ўлез у карупцыю. Аб яго падзенні. А колькі такіх! Але толькі пачаў і зноў доўга не мог заснуць» [13, с. 439]; «Скончыў “Падзенне” – і адчуў не радасць, а смутак. Найшла нейкая спустошанасць. З’яўлялася раней нешта, падобнае на страх: а ці з’явіцца новы сюжэт? Часам гэта боязь “спісанасці” цягнулася месяцамі. Канчалася ў адну ноч: “прыходзіў” сюжэт. Але цяпер нешта іншае. Таго, што спісаўся, не баюся. Напісаў – дзякуй богу. Страшна іншае: а каму гэта трэба ў наш час? Якія эмоцыі выкліча гісторыя развалу добрай сям’і? Усё развальваецца! Вось чаму сумна ці пуста ў душы» [13, с. 443]. Страта маральных нормаў і прынцыпаў, чалавечай прыстойнасці і этычнай чысціні – вось у чым бачыў пагрозу пісьменнік і гэта паказваў на канкрэтных жыццёвых прыкладах, адмоўных вобразах-персанажах, па сутнасці папярэджваючы пра тое самае горшае, што можа здарыцца з грамадствам, заклікаючы людзей адумацца і спыніцца ў сваёй безразважнасці, безадказнасці перад будучыняй. А разбуральныя працэсы асобы могуць мець сур’ёзныя і цяжкія наступствы. Таму ў дзённіку і ў сваіх аповесцях пісьменнік выказваўся ўсхвалявана, узрушана, драматызуючы абставіны часу і жыцця, месцамі адкрыта, не хаваючы сваіх поглядаў і ацэнак, з грамадзянскай публіцыстычнасцю, палемічнай завостранасцю.

У творах пісьменніка ёсць па-свойму адметныя героі – гэта прадстаўнікі старой творчай інтэлігенцыі. Яны – людзі неабыякавыя, балюча перажываюць праз тое, што здарылася з некалі вялікай краінай і што адбываецца навокал, для іх характэрна, кажучы словамі самога пісьменніка, «грамадзянскае сумленне» [12, с. 171]. Іван Андрэевіч, герой твораў «Paradies auf erden» і «Вернісаж», – прататып самога Івана Пятровіча Шамякіна, немаладога ўжо пісьменніка, яго аўтарскі голас, альтар эга (alter ego) ці, так бы мовіць, своеасаблівы «рупар», праз які ён агучвае сваё разуменне творчых праблем, сучаснай яму рэчаіснасці. На прапанову напісаць п’есу ён адказвае: «У мяне трагедыя. Для рамана, для п’есы трэба Герой. А хто ён… сённяшні герой?» [12, с. 67]. «Мы страцілі герояў…» – прызнаецца стары драматург Іпаліт Пятровіч (як няцяжка заўважыць, таксама аўтарскі прататыпны

герой) у аповесці «Крывінка». Ён з сумам канстатуе: «…Але станоўчых персанажаў не атрымалася. Толькі адмоўныя… У маім мысленні адбыўся пераварот» [11, с. 291]. Шамякіна-пісьменніка займалі пошукі героя свайго часу (дарэчы, яго заўсёды шукала літаратура), які быў бы ідэалам, маральным арыенцірам для чытача, для сучаснікаў. Вуснамі старога драматурга з «Крывінкі» гаворыць Іван Шамякін: «Я шукаю героя. Я шукаю героя! За апошнія тры гады я напісаў чатыры п'есы. Ніводная не пастаўлена. Ніводная. Няма героя! Няма. Вот трагедыя. Дзе ён, герой?» [11, с. 291]. Дзённікі пісьменніка першай паловы 1990-х гг. узмацняюць ураженне гэтай парадаксальнай, нават тупіковай сітуацыі, калі вобразу антыгероя ўласна і супрацьпаставіць няма каго. Думаецца, акцэнтацыю ўвагі на адмоўных персанажных тыпах можна растлумачыць постсавецкім сіндромам, які спарадзіў крызіс аўтарскага светаадчування.

Новы клас багацеяў-камерсантаў пісьменнік не прыняў. Не бачыў патрэбы ў тым, кажучы словамі М. Багдановіча, каб «чысціць боты капіталу» [1, с. 276]. Прагматычна-меркантыльны сэнс жыцця з мэтай непамернага ўзбагачэння за кошт іншых, ваўчыныя законы існавання паводле прынцыпу «што адхапіў, тое і маё» асуджаў з пазіцый савецкага чалавека і звычайнага, простага беларуса, прытрымліваўся народнага маральна-этычнага кодэксу, асноў і норм чалавечай маралі. Адкрытая спекуляцыя, рабаўніцтва, разбой, вымагальніцтва, хабарніцтва, фінансавыя махінацыі… Чаго толькі ні было ў тыя 1990-я гг., і ўсе беды ды няшчасці людзей Іван Пятровіч блізка прымаў да сэрца, напружана асэнсоўваў і ўдумліва аналізаваў многае. Постсавецкі час з яго негатывам, супярэчлівасцю атрымаў адмоўную трактоўку таксама ў творах М. Танка, П. Панчанкі, В. Быкава, В. Казько, Ю. Станкевіча і інш. Канцэпцыя рэчаіснасці была змрочнай, трагічнай, грамадства апынулася ў абладзе Чарнобыля – радыяцыйнага і маральнага. Пры ўвасабленні сюжэта і канфлікту ў аповесці «Без пакаяння» пісьменнік меў за мэту паказаць маральны распад, дэградацыю асобы героя, які з'яўляецца антыподам аўтарскага разумення чалавека, яго сутнасці:

«Развіццё сюжэта – як бандыт гэты азвярэлы адкупліваецца ад правасуддзя; барацьба двух работнікаў пракуратуры – сумленнага следчага і начальніка-хабарніка» [13, с. 478]. Пісьменнік абраў пазіцыю жорсткага рэаліста: «А я трымаюся філасофіі: калі жыццё – трагедыя, то натуральна, што ў лёсе людзей, сем’яў трагедый стала непамерна больш. І наш абавязак – паказаць іх» [13, с. 448]. Фіналы амаль усіх твораў пра тагачасную рэальнасць канца XX ст. трагічныя, скептыцызм і фаталізм у цяжкіх сацыяльных і маральна-псіхалагічных абставінах – як наканаванасць бязрадаснага існавання, вынік апатыі і расчараванасці. Нездарма родныя Івана Пятровіча, найперш жонка Марыя Філатаўна і дачка Таццяна Іванаўна, дакаралі, па яго словах, за тое, што «многа смерцяў пачаў пісаць» [13, с. 490]. У адным з твораў пісьменнік паспрабаваў «змякчыць» фінал, не без уплыву, як зразумела, ушчуванняў, крытыкі. Тое, што атрымалася, не задавальняла празаіка, які лічыў, што «кампраміс» пайшоў не на карысць лагічнаму завяршэнню фабулы, мастацкай праўды твора: «Скончыў аповесць “Бумеранг”. Эпапея: герой успамінае жыццё – вайну, палон, партызанства ў Югаславіі, лагер (наш). Але адмовіўся ад трагічнага фіналу – смерці гераіні, дачкі Жыгуновіча, і, думаю, аслабіў сюжэт» [13, с. 490]. Шамякінская канцэпцыя трагічнага блізкая да светабачання А. Блока, які ў свой час казаў пра паразу, крах гуманізму як філасофіі і этыка-сацыяльнай дактрыны. Рускі паэт лічыў, што «трагічнае… адно здольнае даць ключ да разумення складанасці свету» [3, с. 105]. Пісьменнік шукаў выйсце са складанай сацыяльна-маральнай і экзістэнцыйнай сітуацыі, якую можна пазначыць-маркіраваць загалоўкам шамякінскага твора: «Зона павышанай радыяцыі». У аповесці «Падзенне» на самым пачатку ён актуалізуе тое, што мае непераходны духоўна-аксіялагічны, анталагічна-каштоўнасны сэнс: «Не ржавее і не паддаецца пазалоце толькі адно пачуццё – Любоў: да зямлі, якую называеш Радзімай, да народа, якому служыш, і да дзяцей, якіх нарадзіў» [12, с. 161]. У гэтай формуле ўвасоблены найвышэйшы, можна сказаць, універсальны сэнс чалавечага быцця.

Чытаючы шамякінскія дзённікі, пераконваешся ў адкрытасці пісьменніка людзям і свету ва ўсіх праявах. Перад намі жывы чалавек з яго думкамі, меркаваннямі, эмоцыямі, сумненнямі, засмучэннямі… Калі ён адстойвае маральныя прынцыпы жыцця, разважае пра суадносіны дабра і зла, ацэньвае чалавечыя паводзіны, матывы, учынкі, памкненні з маральна-этычнай пазіцыі, то ў пазітыўным сэнсе гэтага слова яго можна назваць талстоўцам. Са старонак кнігі «Роздум на апошнім перагоне» Іван Пятровіч, апрача іншага, паўстае як філосаф-шукальнік праўды пра зменлівы і драматычны час, пра неўладкаваны соцыум, пра трансфармацыю чалавека ў перыяд нестабільнасці, сацыяльных катаклізмаў. Ён быў летапісцам-хранікёрам нялёгкага і пакутнага жыцця народа на мяжы стагоддзяў, на зломе эпох, у складаны гістарычны перыяд. Яго дзённікавыя запісы поруч з творамі аналагічнага жанру М. Танка, П. Панчанкі, В. Быкава, Я. Скрыгана, А. Карпюка, У. Караткевіча і іншых пісьменнікаў належаць да каштоўных дакументаў часу і эпохі.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Багдановіч М. Выбраныя творы. Мінск: Беларус. кнігазбор, 1996.

2. Беларускія пісьменнікі: біябібліягр. слоўнік: у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы АН Беларусі; Беларус. Энцыкл., Нац. навук.-асветны цэнтр імя Ф. Скарыны; пад рэд. А. В. Мальдзіса; рэдкал.: І. Э. Багдановіч [і інш.]. Мінск: БелЭн, 1995. Т. 6.

3. Блок А. Собрание сочинений: в 8 т. М.; Л.: ГИХЛ, 1962. Т. 6.

4. Шамякіна Т. І. Іван Шамякін: вядомы і невядомы: успаміны, эсэ, аповесць. Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011.

5. Каваленка В. А. Іван Шамякін: нарыс жыцця і творчасці. Мінск: Нар. асвета, 1980.

6. Мушынскі М. І. Летапіс жыцця і творчасці Івана Пятровіча Шамякіна / НАН Беларусі, Цэнтр дослед. беларус.

культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства імя Я. Купалы. Мінск: Беларус. навука, 2020.

7. Панчанка П. Думаю, думаю…: дзённікі // Полымя. 1998. № 5. С. 3–34.

8. Тычына М. А. Чалавечае вымярэнне ў сучаснай беларускай прозе // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI вв.: сб. науч. статей: в 2 ч. Минск: РИВШ, 2010. Ч. 1. С. 16–24.

9. Шамякін І. Збор твораў: у 23 т. / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы. Мінск: Маст. літ, 2014. Т. 22: Роздум на апошнім перагоне: дзённікі 1980–1994 гадоў.

10. Шамякін І. Карэнні і галіны: партрэты настаўнікаў, сяброў, бацькоў, сваякоў, штрыхі да аўтапартрэта. Мінск: Маст. літ., 1986.

11. Шамякін І. Палеская мадонна: аповесці. Мінск: Юнацтва, 1998.

12. Шамякін, І. Сатанінскі тур: аповесці Мінск: Маст. літ., 1995.

13. Шамякін І. Роздум на апошнім перагоне: дзённікі 1980–1995 гадоў. Мінск: Маст. літ., 1998.

## ВАЙНА Ў ТВОРЧАСЦІ ІВАНА ШАМЯКІНА

**А. І. Шамякіна**

*Інстытут літаратуразнаўства імя Я. Купалы НАН Беларусі, вул. Сурганова, д. 1/2, 220072, Мінск, Беларусь,*
*ivan-makhon@rambler.ru*

У артыкуле разглядаецца ваенная тэма ў творчасці вядомага беларускага пісьменніка Івана Шамякіна. Прыводзяцца дзённікавыя запісы і звесткі пра дзейнасць пісьменніка ў гады Вялікай Айчыннай